# Наши юбиляры

## ЕФРАСІННЯ ЛЕАНІДАЎНА БОНДАРАВА
## (да 70-годдзя з дня нараджэння)



У журналісцкім асяроддзі Беларусі не сустрэнеш чалавека, які б не ведаў прафесара Е. Л. Бондараву. Без прафесара Бондаравай наогул нельга ўявіць факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта: студэнцкія навуковыя канферэнцыі (яна нязменны старшыня журфакаўскага СНТ), Саветы факультэта, гарачыя кафедральныя спрэчкі. Бондарава—у цэнтры дыскусій, яе меркаванні і прапановы заўсёды цікавыя і арыгінальныя, калегі прыслухоўваюцца да іх з асаблівай увагай. А нумары вучэбных газет «Журналіст», што студэнты выпускаюць пад кіраўніцтвам Бондаравай, па ўзроўню прафесійнага майстэрства і грунтоўнасці распрацоўваемых тэм можна параўноўваць з рэспубліканскімі перыядычнымі выданнямі.

За плячыма Е. Л. Бондаравай—вялікі жыццёвы і педагагічны вопыт, які дапамагае аптымальна спалучаць разумную патрабавальнасць і дабрыню. Многія пакаленні выпускнікоў універсітэта з удзячнасцю ўспамінаюць сваю настаўніцу.

Журналістка Лёзненскай раённай газеты Ефрасіння Бондарава ў 1945 г. паступіла і ў 1949-м скончыла Белдзяржуніверсітэт, потым—аспірантуру. У 1953 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю, у 1977-м доктарскую дысертацыю на тэму, прысвечаную праблемам кінакрытыкі.

Е. Л. Бондарава апублікавала шэраг навуковых работ, грунтоўныя даследаванні па кінамастацтву, кінасцэнарыі, шмат крытычных і публіцыстычных артыкулаў, манаграфіі «Час. Экран. Крытыка», «Экран у розных вымярэннях», «Кінастужка даўжынёю ў жыццё», а таксама брашуры, мноства вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Е. Л. Бондарава—Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, член двух творчых саюзаў—журналістаў і кінематаграфістаў, член рэдкалегій Беларускай Энцыклапедыі, часопіса «Мастацтва». На працягу доўгага часу Е. Л. Бондарава была старшынёй секцыі кінакрытыкаў Беларусі, членам мастацкага савета кінастудыі «Беларусьфільм», старшынёй метадычнага савета Рэспубліканскага Дома кіно.

Ефрасіння Леанідаўна—чалавек, здаецца, нястомны. Яе неабыякавасці да жыцця можна па-добраму пазайздросціць. Зараз, калі надышла юбілейная дата прафесара Бондаравай, калегі, студэнты журфака жадаюць ёй вялікіх творчых і жыццёвых поспехаў, захоўваць па-ранейшаму актыўную цікавасць да грамадскіх падзей, не страчваць маладосці душы.